# Вуліца Карбышава

*Калнін, В.В. Вуліца Карбышава / В.В. Калнін // Калнін, В.В. Гродна ў дыялогу стагоддзяў: альбом / В.В. Калнін. - Мінск: Кавалер, 2008. - С. 156-174.*

У цэнтральнай частцы Гродна на сутыку вуліц Леніна і Карбышава ёсць адно цікавае гарадское скрыжаванне. Яго можна назваць нават маленькай плошчай. Па супрацьлеглых вуглах размясціліся два будынкі адмысловай архітэктуры, іх фасады вырашаны ў выглядзе вежаў з спічастымі дахамі, пакрытымі чарапіцай. Дамы - як модныя дамы: у аднаго адзенне з далікатных памараньчавых цаглін, апаясаных тонкай прафіляванай тынкоўкай; у другога па сценах накідная тынкоўка "пад шубу", вузкія вокны - быццам вочкі, прытуленыя футрам.



Дамы пабудаваны ў стылі мадэрн каля ста гадоў таму. Адна з вуліц скрыжавання называлася Сафійскай, другая - Палявой. Дом "пад шубай" належаў урачу Тальгейму, другі, "памараньчавы", - пазямельна-сялянскаму банку.

У адным з памянёных будынкаў савецкі генерал-лейтэнант інжынерных войскаў Дзмітрый Карбышаў сустрэў Вялікую Айчынную вайну. Ён прыехаў сюды з Масквы, каб правесці інспекцыю ўмацаваных раёнаў (УРаў) у ваколіцах Гродна.

Да пачатку вайны заставалася 13 дзён. На граніцы панавала цішыня. Ішла спакойная планавая праца. Кожны раз пасля чарговага агляду ўмацаванняў Карбышаў вяртаўся ў адзін з дамоў на скрыжаванні і пісаў лісты дадому, у Маскву: "Жыву я ціха, мірна, дакладней, не жыву, а цэлы дзень трасуся ў машыне. У мяне вялікі, добры пакой, так што жыць і працаваць добра... Вакол сад, кветкі і поўная цішыня".

Вуліца Карбышава паблізу скрыжавання і зараз даволі зацішная. Захаваліся некаторыя дамы ад мадэрна, захаваліся сады, улетку поўныя кветак. У нейкі момант тут можна адчуць сябе перанесеным у іншы час.

Перадваенны Гродна. Па тратуарных плітках з надпісам "Ашкеназы" крочыць цвёрдаю хадою невысокага росту, сухенькі, пажылы вайсковец у палявой форме. У пятліцах тры зорачкі з сякеркамі. Прыпыніўся ў задуменні. Аб чым? Пра подых вайны, які мацней адчуваўся тут, каля самай мяжы? Пра непадрыхтаванасць УРаў ці пра магчымасць выкарыстання старых фартоў, збудаваных яшчэ да імперыялістычнай? Або пра набліжэнне цёплых дзён і запланаваны адпачынак з старэйшай дачкой у Сочы? Мы не ведаем. Магчыма, усё было інакш.

У юнацтве Карбышаў марыў пра архітэктуру, але на такую вучобу не хапіла сродкаў. Пайшоў па традыцыйнай у сям'і вайсковай справе і выбраў службу інжынераў. У 1911 годзе пасля ваенна-інжынернай акадэміі скіраваны на ўзвядзенне новых умацаванняў крэпасці Брэст-Літоўск. Пазней да вайсковых планаў новых крэпасцей далучылі Гродна. Давялося дапамагаць сябрам па службе і праектамі, і парадамі на месцы. Наезды сюды былі кароткія, але прыемныя. Запомнілася прырода вакол Аўгустоўскага канала. І зараз з інспекцыяй новых умацаваных раёнаў давядзецца ехаць менавіта туды. Якія яны, старыя фарты?



Ен зноў тут. Ад першага візіту сюды мінула чвэрць веку з лішкам. Імперыялістычная, грамадзянская, фінская праляцелі за вайсковай працай, нібы куля. Але першыя ўражанні ад гэтага горада сцерціся не паспелі. Дамы паблізу тады толькі пабудавалі. Прыгожыя, светлыя, па новай модзе.

У роздуме не заўважыў, як дайшоў да канца вуліцы. Тут, у цэнтры горада, дзіўная планіроўка, не радыяльная і не прамакутная. Вуліцы з завулкамі пераплецены і сутыкаюцца, як траншэі на перадавой - крывыя ды вузкія, "двум не разысціся". А гэтая вуліца зусім кароценькая, усяго па чатыры дамы з кожнага боку, былая Іванаўская. Вось і шыльдачка захавалася, праўда, польская: "Hoovera" - напэўна, у гонар амерыканскага прэзідэнта Гувера, што ладзіў дапамогу Еўропе пасля сусветнай вайны.

Тут выхад на галоўную, былую Саборную. Па вуглах дамоў новыя шыльды: "Вуліца Савецкая". Толькі выгляд вуліцы пакуль той жа, даўнейшы: дамы, выцягнутыя, як пенал, амаль без аздобаў, адно нізкі франтон з частымі зубчыкамі падкрэслівае значнасць пабудовы. Гэта суровы класіцызм. А далей стракаты частакол пазнейшых камяніц, тынкаваных і фарбаваных на розныя лады, з мудрагелістымі ліштвамі, карункавымі балкончыкамі, па нізе - крамы і крамікі. Зараз гандляроў і шыльдаў паменела - канкурэнцыі з дзяржаўным гандлем ім ужо не вытрымаць.

У адваротным накірунку Іванаўская робіць зігзаг, быццам выслізгвае з блытаніны старых вуліц і выходзіць на болыш шырокі адрэзак. Тут новы свет, новая архітэктура. Дамы стаяць ужо не частаколам, а вялікімі блокамі. Вуглы дзеля мяккасці абрысу скошаны і ўвенчаны вежачкай-эркерам. Па сценах далікатныя рэльефныя аздобы з плывучых ліній і кудзёрак накшталт водарасцяў з гербарыя, высушаных і адпрасаваных. Парасткі тых водарасцяў, толькі каваныя з металу, паплылі па балконах, а ўнізе, пад цяністымі

казыркамі каля ўваходных дзвярэй, “прараслі” выгнутымі букецікамі. Нарэшце каваная “расліннасць” дасягае неба і асядае на даху лёгкай балюстрадай.

Далей наперадзе будынак зусім без аздоб. Гэта былы польскі банк у стылі функцыяналізму. Геаметрычны паралелепіпед, апаясаны некалькімі радкамі вакон living розна калібру, як ладная скрыня з боепрыпасамі.

Вось і ўся вуліца - былая Палявая. Трэба вяртацца да свайго пакоя і закончыць лісты дадому.

"Добрага здароўя, дарагія мама, бабуля і дзеці. Ад Лялі атрымаў адну тэлеграму, ад вас вестачкі няма. Пішу вам і Лялі пакуль акуратна і кожнага дня. Відаць, гэты тыдзень прабуду ў Гродне, а затым паеду - куды, дакладна не ведаю. Магчыма, у канцы тыдня перабяруся ў Беласток... Тут усталявалася цёплае надвор’е, у лесе процьма камароў. А вас там камары не турбуюць?..." Ляля - старэйшая дачка, вучылася на вайсковага інжынера ў Ленінградзе. Цытаваныя радкі - апошняе пасланне Карбышава родным.



Праз тры дні пачалася вайна. Карбышаў ужо не меў фармальнай прычыны заставацца ў Гродне. Некалькі разоў яму прапаноўвалі вярнуцца ў Маскву. Усе разумелі, што Карбышаў болыпую карысць прынясе там, у сталіцы, а не на перадавой. Але шасцідзесяцігадовы генерал ад усіх прапаноў адмаўляўся: “Пакіньце гэтыя непатрэбныя размовы, усе толькі аб гэтым і гавораць... Я салдат, а салдат у такі момант не ад’язджае, не кідае фронт”.

Прычынай гэтага ўчынку Карбышава быў не толькі ваенны абавязак. Здаецца, немалую ролю адыграў яго асабісты сентымент да Беларусі. Тут пачыналася яго служба пасля сканчэння акадэміі. Адсюль была родам яго жонка, Лідзія Васільеўна. Дачка Карбышава Алена Дзмітрыеўна ўспамінала, што мама часам гаварыла пра сябе: “я беларуска” (малую гэта здзіўляла: “Якая ж ты беларучка?”). З палявых вучэнняў 1940 года ў Заходняй акрузе Карбышаў піша: “Паколькі маю «сваю» машыну, я зараз паеду ў мястэчка Ружаны (непадалёк, мама, ад твайго знакамітага Даманава)”. І ўжо з Гродна напярэдадні вайны: ”Я б вельмі жадаў, каб вы з мамай самі прыехалі і паглядзелі тутэйшыя мясціны. Мама аб гэтым даўно марыць”.

Лідзія Васільеўна была дачкой чыгуначніка Асецкага, які служыў начальнікам невялічкіх станцый. Пачынаў ён службу яшчэ ў 80-я гады пазамінулага стагоддзя пад Оршай. Потым былі станцыі Прыяміна, Фаніпаль,

Койданава, Даманава - таксама на лініі Орша-Брэст. Відаць, тут прайшлі дзіцячыя гады Лідзіі Васільеўны. У 1914 годзе бацька выйшаў на пенсію, сям'я пераехала ў Мінск. Адсюль маладая дзяўчына Лідзія выпраўляецца на фронт ратаваць параненых у баі. У карпацкіх Бяскідах адбылося знаёмства з Карбышавым. Яна перажыла мужа на трыццаць гадоў, трымаючы ў кішэні халата яго апошні ліст з Гродна.

Ад Гродна пачаўся трагічны шлях Карбышава ў вечнасць. Адхіліўшы магчымасць вярнуцца ў Маскву, ён удзельнічаў у абароне беларускіх гарадоў Гродна і Ваўкавыска, быў паранены пад Магілёвам і трапіў у палон. Не пакораны ворагам, Карбышаў прыкладам асабістай мужнасці ва ўмовах фашысцкіх канцлагераў мацаваў у вязняў веру ў перамогу, быў завадатарам у падпольным змаганні.

Тры гады ў Гродне шугала полымя вайны. У адным з фартоў, якія аглядаў Карбышаў у апошнія мірныя дні, фашысты знішчожылі больш за 3 тысячы жыхароў горада. Калі Гродна вызвалілі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў, Карбышаў яшчэ быў жывы. Яго закатавалі за тры месяцы да канца вайны.

Імя Карбышава вядома ў Гродне не толькі з назвы вуліцы. Яго носіць школа № 15 і пры ёй ёсць музей, традыцыйнымі сталі ў Гродне спартыўныя спаборніцтвы на прыз героя па матакросе і барацьбе.

...Калі я бываю на гэтым гродзенскім скрыжаванні, то праз архітэктуру яго будынкаў перад вачыма ўзнікае знаёмы па фотаздымках вобраз знакамітага генерала: інтэлігентны выраз твару з высокім аголеным ілбом і акуратнымі зачосамі тонкіх валасоў па баках. Яшчэ згадваецца гордая пастава ўсёй галавы на вытанчанай шыі і строгая падцягнутасць вайсковай формы. Аблічча славутага генерала і строгія вытанчаныя формы дамоў на скрыжаванні моцна зліліся ў свядомасці, і гэты куточак горада даваеннай пары інакш не ўяўляецца.